# З УСПАМІНАЎ ОСТАРБАЙТАРА З ВАРАНОЎ А.І.СЦЕПАНЧУКА

- Прайшоў не адзін дзесятак гадоў, - з болем у голасе ўспамінае Аляксандр Іванавіч,- але не сцёрся з памяці той дзень, калі кожны з трывогай, са страхам у вачах гаварыў аб вайне. Аж тут, у Варанах (пад Старым Дворцам), чулі, як самалёты скідвалі бомбы дзесьці ў раёне Бераставіцы. Ніколі не забудзецца і такі эпізод, як маці, вярнуўшыся са Старога Дворца, расказала аб тым, як нізка-нізка праляцеў над вёскай нямецкі самалёт і кулямётнай чаргой ледзь не забіў падлетка, які ехаў на кані.

І вось немцы ў вёсцы, прыехалі на матацыклах, рукавы закасаныя па локці. Усюды развесілі аб'явы, у якіх за любое парушэнне нямецкіх загадаў пагражалі расстрэлам. А ў лясах хаваліся акружэнцы, кожны вечар яны стукаліся да кагосьці з вяскоўцаў і прасілі паесці. А хіба ж маглі нашы людзі адмовіць у самым неабходным гэтым знясіленым, параненым, абарваным і галодным байцам. Канешне ж, давалі ўсе, што маглі. Але знайшліся і ў Лявонавічах, і ў Варанах здраднікі, якія тут жа паведамлялі нямецкім уладам. І амаль кожную раніцу (не паспявалі нават выгнаць на пашу іншы раз статак) вёску акружалі фашысты, зганялі людзей і пяць-шэсць чалавек, да каго наведваліся акружэнцы, забіралі з сабой, адвозілі далей ад вёскі, жорстка білі, а затым расстрэльвалі. Вяскоўцы адшуквалі расстраляных і таемна, па хрысціянскім звычаі, хавалі іх на могілках. Давялося і Аляксандру Іванавічу дапамагаць хаваць расстраляных. Як цяпер, стаіць у вачах жудаснае відовішча: галава расстралянай фашысцкімі нелюдзямі жанчыны ўяўляла страшнае крывавае месіва, а ў ранах глыбока заселі кавалкі грэбеня. Яна нават яшчэ слаба варушылася, калі яе знайшлі. Ніхто, нават мужчыны, не маглі без слёз глядзець на бедную жанчыну, у якой дома засталіся непаўналетнія дзеці.

А пасля прыязджалі немцы не толькі ў ваенным абмундзіраванні, але і ў цывільным і агітавалі моладзь ехаць працаваць у Германію. Але ніхто дабраахвотна не хацеў. Тады ворагі сілай збіралі маладых хлопцаў і дзяўчат і адвозілі ў Бераставіцу, а адтуль грузілі ў машыны і везлі ў Гродна. Яшчэ і цяпер стаіць у вушах плач, енк мацярок, у якіх забіралі дарослых дзяцей. У горы рвалі валасы, заломвалі рукі. Ды фашысты ні на што не зважалі.

Усіх прывезлі да лазні, прымусілі раздзецца, мыцца, кожнага апырсквалі нейкай непрыемнай і едкай вадкасцю, адзенне таксама было апрацавана чымсьці. А пасля ўсіх пагрузілі ў таварныя вагоны.

Ежы не давалі ніякай, толькі тое, што ўзялі з дома. На рэдкіх станцыях прыносілі ваду, якую тут жа выпівалі. У вагонах цесна, душна, лямант, плач, непрыемны пах, некаторыя трацілі прытомнасць, хварэлі. Былі і смельчакі, якія спрабавалі ўцячы, але па іх тут жа стралялі.

І вось чужая і ненавісная краіна. Усіх пастроілі, а немцы ў ваенным і цывільным, нібы рабоў, аглядалі юнакоў і дзяўчат, на каго паказвалі, іх выводзілі са строю і забіралі...

Я спрабую сябе паставіць на іх месца і разумею: гэта так жудасна… Апынуцца ў чужой, варожай табе краіне, дзе гучыць чужая мова, дзе ні аднаго спагадлівага позірку, дзе няма самых блізкіх і родных людзей. “Не дай, Божа!” – як гаворыць мая бабуля. А забіралі ж і 15-16-гадовых у сорак чацвёртым годзе, як расказвала нам Лукашык Зінаіда Гаўрылаўна, жыхарка вёскі Вараны, якую таксама не абмінула гэтая бяда. Становіцца не па сабе: яны былі маімі равеснікамі! І хочацца нізка схіліць галаву перад імі, пакутнікамі.

Аляксандр Іванавіч працягваў:

- Дванаццаць чалавек з Беларусі выбраў немец у цывільным, і на машыне прывезлі нас у маёнтак Вендзіке-Вальдэ. Знаходзіўся гэты маёнтак за два кіламетры ад нямецкага гарадка Цільзіт. Працавалі мы разам з палякамі на цагляным заводзе: фармавалі цэглу, абпальвалі, сушылі, а затым грузілі на машыны. Кармілі дрэнна, і, калі б не пасылкі з дому, давялося б вельмі цяжка.

Калі ж пачаў прыбліжацца фронт, то кожны дзень адпраўлялі капаць траншэі. Але як ні ўмацоўвалі фашысты свае пазіцыі, аднойчы раніцай, прачнуўшыся, мы пачулі стральбу, гаспадароў маёнтка не стала, а ў барак уварваліся нашы байцы.

І вось доўгачаканае вызваленне, вызваленне ад прыніжэння, зняваг. Столькі радасці, слёз, хвалявання!.. Але вайна працягвалася, і я ў 1944 годзе стаў байцом. Служыў у 165 гвардзейскім палку мінамётчыкам, на трэцім Беларускім фронце.

Успаміны А.І. Сцепанчука падрыхтавала да друку
ўнучка Настасся Лазарчык, в.Стары Дворац,
2009 год.